тырох строф, сустракаецца ў жніўных [5, с. 144, 146] і вясельных сіроцкіх напевах [6, с. 203].

Аднак музычным прататыпам (па агульным меладычным контуры, шырокім дыяпазоне мелодыі, а таксама рэзкіх рэгістравых скачках) для песні Рыгора стаў беларускі напеў "Ой, палын мой, палыночак", змешчаны ў анталогіі Г. Цітовіча ў раздзеле "Песні пра прыгнёт" [1, с. 350]. Папершае, тут назіраюцца знакавыя для разглядаанай песні інтанацыі (трохгучны інцыпітны ход і чатырохгучны зыходны матыў у квартавым дыяпазоне). Па-другое, у якасці ладавай апоры выкарыстаны лад з субсекундай і субквартай. Па-трэцяе, кампазіцыйнае размеркаванне меладычнай лініі песні Рыгора і яе прататыпа арганізавана такім чынам, што ў прыпеве ў абодвух выпадках мелодыя робіць вялікі і рэзкі скачок на актаву ўверх. У семантычным плане гэта можна трактаваць як поўны болю і жальбы ўскрык чалавека, які страціў апошнюю надзею.

Такім чынам, інтанацыйнасць беларускай народнай песні ў операх апошняй трэці ХХ ст. на нацыянальныя гістарычныя сюжэты, якія атрымалі сцэнічную рэалізацыю, у першую чаргу паўплывала на структурную і ладавую арганізацыю меладычнай лініі вакальных партый герояў у фальклорна арыентаваных эпізодах. Прынцыпы пераламлення нацыянальнай інтанацыйнасці ў мелодыцы такіх сцэн праяўляюцца двухбакова:

– у выглядзе прамых меладычных цытат (эпізод прыёму гасцей у оперы "Князь Наваградскі" А. Бандарэнкі, жаночы хор "Ля крынічанькі, ля вадзічанькі" ў фальклорна арыентаваным эпізодзе "Дзікага палявання караля Стаха" У. Солтана);

– у апоры на яркія рэпрэзентацыйныя інтанацыі беларускіх народных напеваў (песні дзяўчат у эпізодзе "Беларускі краявід" у оперы "Сівая легенда" Д. Смольскага, мужчынскі хор і песня Рыгора ў "Дзікім паляванні караля Стаха" У. Солтана).

Інтанацыйнасць беларускіх народных песень, арганічна ўплеценая ў мелодыку опер на нацыянальныя гістарычныя сюжэты, сведчыць пра глыбіннае разуменне кампазітарамі роднага фальклору, дзякуючы чаму магчыма дакладная характарыстыка звычаяў, традыцый, а таксама псіхалогіі і менталітэту беларусаў.

**Спіс літаратуры**

1. **Анталогія беларускай народнай песні** / уклад., прадмова і камент. Г. Цітовіча. – Мінск : Беларусь, 1975. – 616 с.

2. **Ширма, Г.** Двести белорусских народных песен / Г. Ширма. – М. : Советский композитор, 1958. – 276 с.

3. **Шырма, Р.** Беларускія народныя песні : у 4 т. / Р. Шырма. – Мінск : Дзяржаўнае выд-ва БССР, 1959. – Т. 1. – 424 с.

4. **Шырма, Р.** Беларускія народныя песні : у 4 т. / Р. Шырма. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1960. – Т. 2. – 430 с.

5. **Шырма, Р.** Беларускія народныя песні : у 4 т. / Р. Шырма. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1962. – Т. 3. – 308 с.

6. **Шырма, Р.** Беларускія народныя песні : у 4 т. / Р. Шырма. – Мінск : Беларусь, 1976. – Т. 4. – 379 с.

**Ірына ПІЛАТАВА,**
кандыдат мастацтвазнаўства.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 2 мая 2017 г.*

*Актуальная тэма*

# ПЕРСПЕКТЫВЫ ЗАХАВАННЯ І ПРЭЗЕНТАЦЫІ СЯДЗІБНА-ЛАНДШАФТНЫХ КОМПЛЕКСАЎ ЯК ЧАСТКІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

Захаванне матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны – адна з галоўных задач сучаснага грамадства. Менавіта сядзіба доўгі час з'яўлялася асноўнай крыніцай фарміравання народнай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Сядзібна-ландшафтны комплекс як сукупнасць помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва і культурнага ландшафту пэўнай мясцовасці праз захаванне, прэзентацыю і папулярызацыю гістарычнай памяці выступае значным фактарам грамадскага развіцця.

У артыкуле разглядаюцца сядзібна-ландшафтныя комплексы на тэрыторыі Беларусі. Паказана значнасць сядзібнай культуры для трансляцыі яе будучым пакаленням. Уздымаецца праблема захавання культурнага ландшафту як складніка сядзібы. Вылучаюцца аптымальныя кірункі захавання і далейшай прэзентацыі помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва ў сучасных сацыякультурных умовах.

Ключавыя словы: *сядзіба, ландшафт, сядзібна-ландшафтны комплекс, матэрыяльная культура, музеефікацыя.*

Preservation of tangible and intangible cultural and historical heritage is one of the main challenges of modern society. For a long time country estates have been one of the main sources of people's spiritual and material culture. As a combination of monuments of landscape gardening, estate building and cultural landscape in the certain region, manor-landscape complexes perform an important role in social development through the preservation, presentation and promotion of the historical heritage.

The article discusses manor-landscape complexes on the territory of Belarus. The author is showing the importance of manor culture for it's translation to future generations, highlights problems of preserving of the cultural landscape as a part of the manor, defines the best ways of preserving and further presentation of manor-landscape complexes in the contemporary socio-cultural conditions.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перш чым перайсці да раскрыцця заяўленай тэмы, засяродзім увагу на дэфініцыі паняцця *сядзібна-ландшафтны комплекс*. Мы будзем карыстацца вызначэннем яго як *часткі лакальнай прасторы, у склад якой уваходзяць культурны ландшафт пэўнай мясцовасці і размешчаныя на ёй помнікі сядзібна-паркавага мастацтва, значныя для захавання гісторыка-культурнага асяроддзя краіны або рэгіёна*. Такім чынам, сядзібна-ландшафтны комплекс – гэта не толькі тэрыторыя, дзе размяшчаліся сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы, парк, сельскагаспадарчыя і лясныя ўгоддзі, але і своеасаблівы "культурны" складнік. Тут злучаліся прыродныя ўмовы мясцовасці, пэўная сістэма прыродакарыстання, побытавая і мастацкая культура, а таксама сацыякультурная дзейнасць папярэдніх пакаленняў.

Зыходзячы з дзейнай нарматыўна-прававой базы нашай краіны, сядзібна-ландшафтны комплекс можа выступаць як *помнік архітэктуры* і *запаведная мясціна*, таму што ён з'яўляецца асобным, тапаграфічна акрэсленым комплексам аб'ектаў народнага дойлідства і навакольнага ландшафту, створаных ва ўзаемадзеянні чалавека і прыроды; як *помнік гісторыі*, бо на тэрыторыі названых комплексаў адбываліся найважнейшыя гістарычныя падзеі, звязаныя з развіццём тагачаснага грамадства і дзяржавы, навукі, тэхнікі, культуры і г. д. Значэнне захавання такіх помнікаў матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны падкрэслівае і заканадаўства нашай краіны – Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (глава 16, артыкул 82), які сцвярджае, што "гісторыка-культурная спадчына ўяўляе сабой сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях" [1, с. 60].

Сядзіба як комплекс жылых, гаспадарчых пабудоў і помнікаў садова-паркавага мастацтва была найбольш выразным культурным і эканамічным утварэннем на пэўным этапе грамадскага развіцця. Звычайна яна ўяўляла сабой складаную сукупнасць супадпарадкаваных архітэктурных і прыродных элементаў і магла ўключаць жылыя збудаванні, гаспадарчыя і вытворчыя памяшканні, сады, паркі, водныя сістэмы, а таксама малыя архітэктурныя формы, якія аб'ядноўваліся адзінай логікай планіровачнага рашэння і былі створаны ў адпаведнасці са стылёвымі прынцыпамі пэўнай эпохі.

На тэрыторыі Беларусі сядзібы пачалі ўзнікаць з XVI ст., што звязана з імкненнем заможнай шляхты пераняць лад жыцця эліты, выразна прадэманстраваць грамадскі статус свайго роду. Фарміраванне беларускага сядзібна-паркавага мастацтва адбывалася ў рэчышчы развіцця агульнаеўрапейскай культуры з улікам мясцовых традыцый, гістарычных і сацыяльна-эканамічных умоў, а таксама ладу жыцця, эстэтычных густаў уладальнікаў. Нярэдка сядзібы, развітыя гаспадарчыя комплексы, узорныя гаспадаркі былі прыкметнай культурна-эканамічнай з'явай краю [5, с. 7 – 9]. На іх базе ўзнікалі родавыя гнёзды, створаныя шматлікімі пакаленнямі: Вішнева (Храптовічы), Лунін (Друцкія-Любецкія), Лагойск (Тышкевічы) і інш. Названыя помнікі належалі аднаму роду (сям'і) на працягу многіх дзесяцігоддзяў.

У планавым вырашэнні сядзіб вялікае значэнне надавалася формам рэльефу, натуральнай расліннасці, гідралагічным і эдафа-кліматычным умовам. У выніку працяглага гістарычнага сінтэзу не проста складвалася сядзіба як форма эканамічнага і культурнага жыцця пэўнай мясцовасці, а ўзнікаў своеасаблівы гісторыка-культурны ландшафт.

Праблема захавання не толькі ўласна памяшкання сядзібы, гаспадарчых пабудоў, размешчаных на пэўнай тэрыторыі, але і культурнага ландшафту (прыродна-культурнага тэрытарыяльнага комплексу, які сфарміраваўся ў выніку эвалюцыйнага ўзаемадзеяння прыроды і чалавека, яго сацыякультурнай і гаспадарчай дзейнасці) вакол яе ўзнікла ў канцы XX ст. [2, с. 16]. Каштоўнасць многіх культурных ландшафтаў, што захаваліся да нашых дзён, бясспрэчная, бо яны таксама валодаюць значнымі гістарычнымі, навуковымі і культурнымі ўласцівасцямі і могуць быць ідэнтыфікаваны як аб'екты гісторыі і культуры.

Каб вылучыць *сядзібны культурны ландшафт* як частку гісторыка-культурнай спадчыны, неабходна, на наш погляд, найперш улічваць асаблівае значэнне сацыякультурнай памяці папярэдніх пакаленняў, якая захавалася і адлюстроўваецца ў матэрыяльных і нематэрыяльных элементах культурнага ландшафту вакол сядзібы і мае непасрэднае дачыненне да дзейнасці яе ўладальнікаў на пэўнай тэрыторыі.

Сядзібны культурны ландшафт фарміраваўся пад уплывам мастацкага густу гаспадара, адлюстроўваў стылёвыя асаблівасці часу і быў цесна звязаны з самымі разнастайнымі відамі мастацтва. Шматлікія помнікі ўзводзіліся па праектах вядомых архітэктараў. Вакол сядзіб не толькі ўзнікалі пейзажныя паркі, штучныя вадаёмы, але і змяняўся ўвесь навакольны ландшафт (напрыклад, арганізацыя штучнага вадаёма пры сядзібе Патоцкіх у Высокім Камянецкага раёна).

Каштоўнасць культурнага ландшафту, а адпаведна і сядзібнага культурнага ландшафту як яго часткі, можа вызначацца па розных крытэрыях. Паводле "Кіраўніцтва па выкананні Канвенцыі аб ахове сусветнай спадчыны" ЮНЕСКА, гэтыя ландшафты падзяляюцца на тры катэгорыі: свядома задуманыя і створаныя чалавекам; ландшафты, якія арганічна развіваюцца (дасягнулі сучаснай формы ў сувязі і пад уздзеяннем свайго прыроднага акружэння); асацыятыўныя культурныя ландшафты [4].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Многія сядзібныя культурныя ландшафты Беларусі могуць быць аднесены да першага тыпу – гэта творы садова-паркавага мастацтва ў сукупнасці з ансамблямі помнікаў архітэктуры (напрыклад, сядзібна-паркавы комплекс Прушынскіх у Лошыцкім парку, сядзібна-паркавы комплекс Нямцэвічаў у Скоках і інш.).

Аднак не ўсе культурныя ландшафты як частка гісторыка-культурнай спадчыны могуць быць ацэнены з пазіцый высокай якасці іх архітэктурна-планіровачнага рашэння і мастацкіх вартасцей. У гэтым выпадку варта разглядаць ландшафт як адзін з варыянтаў, што арганічна развіваецца. Як вядома, сядзіба стваралася ў межах вясковага ландшафту, які ўжо існаваў, альбо гэтыя ландшафты эвалюцыянавалі сумесна (такія сітуацыі ўзнікалі пры асваенні новых тэрыторый). У выніку падобнага ўзаемадзеяння фарміраваўся тыповы вясковa-сядзібны ландшафт. Многія яго рысы захоўваюцца да гэтага часу, нягледзячы на тое, што носьбіты як сядзібнай, так і сялянскай культур не дажылі да нашых дзён. У большасці рэгіёнаў ад падобнага ландшафту засталіся толькі фрагменты, якія, на думку даследчыкаў, не дазваляюць разглядаць яго ў якасці аб'екта спадчыны [2, с. 170 – 171]. Так, пашырэнне тэрыторыі Мінска прывяло да страты многіх сядзібных культурных ландшафтаў (Немаршанскіх у Лошыцы, Ваньковічаў у Сляпянцы і інш.). Можна разглядаць як станоўчы вопыт спробы аднавіць на базе музейных устаноў сядзібныя культурныя ландшафты ў вёсцы Здраўнёва (Віцебскі раён) і ўрочышчы Мерачоўшчына (Івацэвіцкі раён).

Многія сядзібныя культурныя ландшафты Беларусі можна аднесці да асацыятыўных ландшафтаў дзякуючы іх мемарыяльным уласцівасцям. Гаспадарамі або гасцямі такіх сядзібных комплексаў былі вядомыя пісьменнікі, мастакі, музыканты, навукоўцы ці палітычныя дзеячы. Там адбываліся падзеі, што асабліва паўплывалі на сацыякультурнае развіццё рэгіёнаў (напрыклад, сядзібы Н. Орды ў Іванаўскім раёне, Міцкевічаў у Баранавіцкім раёне, купцоў Аўрамавых у Хойніках і многія іншыя).

Вядома, сядзібны культурны ландшафт, які мы бачым сёння, адрозніваецца ад таго, што існаваў на пэўнай тэрыторыі ў XVIII – XIX стст., у перыяд росквіту сядзібнай культуры. Таму пры аднаўленні сядзібы варта звяртацца да паняцця *гістарычны ландшафт*, разумеючы пад ім зрэз культурнага ландшафту на пэўны момант часу, што вядзе да рэканструкцыі сядзібнага культурнага ландшафту, напрыклад, на момант яго стварэння або найбольшага росквіту.

Праблема кансервацыі, рэстаўрацыі, адраджэння і развіцця сядзібнага культурнага ландшафту звязана не толькі з арганізацыяй рэстаўрацыйных і кансервацыйных работ, якія вядуцца на помніках архітэктуры, але і з узнаўленнем былой гаспадарчай дзейнасці. Асабліва значэнне пры гэтым маюць апрацоўка зямель, рэгулярнае выкошванне лугоў, ачыстка вадаёмаў і г. д.

Захаванне і падтрыманне належнага стану сядзібы, своечасовае правядзенне рэстаўрацыйных работ – галоўная частка дзейнасці па захаванні і аднаўленні сядзібна-ландшафтнага комплексу. Варта мець на ўвазе шэраг асаблівасцей, якія адрозніваюць працу рэстаўратараў культурнага ландшафту ад рэстаўратараў помнікаў архітэктуры. Яны, галоўным чынам, звязаны з тым, што культурны ландшафт з'яўляецца дынамічнай сістэмай, якая пастаянна развіваецца. Яго нельга аднавіць або захаваць у поўнай адпаведнасці з якой-небудзь пэўнай гістарычнай датай [2, с. 178 – 179].

Безумоўна, стварэнне музейнага асяроддзя на месцы ранейшага існавання помніка лічыцца аптымальным сродкам выкарыстання і далейшай інтэрпрэтацыі помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва. Менавіта музеефікацыя дазваляе пераўтварыць гісторыка-культурныя або прыродныя аб'екты ў аб'екты музейнага паказу, тым самым максімальна захаваць іх гісторыка-культурную, навуковую, мастацкую каштоўнасць для будучых пакаленняў.

З канца XVIII – пачатку XIX ст. назіраюцца спробы стварэння музейных калекцый на тэрыторыі Беларусі. Мясцовае дваранства канцэнтравала ў родавых гнёздах (пераважна сядзібах) калекцыі па гісторыі краю, прыроды, мастацтва. Можна сказаць, што гэтыя зборы, часцей размешчаныя ў асобных спецыяльна абсталяваных пакоях, былі разлічаны на "музейнае" ўспрыманне гасцямі-наведвальнікамі. Пасля рэвалюцыі 1917 г. шматлікія сядзібы былі нацыяналізаваны савецкай уладай, адны з іх перадалі пад навучальныя і адміністрацыйныя ўстановы, у іншых пачалі працаваць музеі (напрыклад, бібліятэка-музей А. Чэхава ў Таганрогу).

У перыяд 1930 – 1970-х гг. значная колькасць сядзіб, што належалі вядомым дзеячам культуры і мастацтва, музеефікавалася як мемарыяльныя музеі. Падобны падыход характарызаваўся перавагай аналітычнай інтэрпрэтацыі аб'ектаў, раскрыццём іх значэння як помнікаў гісторыі і культуры праз рэстаўрацыю "на аптымальную дату" і арганізацыю экспазіцый па гісторыі помніка і яго рэстаўрацыі. "Аптымальнай датай", на якую праводзіліся рэстаўрацыйныя работы, прызнаваўся час пражывання ў сядзібе мемарыяванай асобы, асноўная ўвага аддавалася дому, значна меншая – парку і іншым элементам. І да нашага часу большасць сучасных сядзіб на тэрыторыі Беларусі, якія захаваліся і выкарыстоўваюцца пад патрэбы грамадства, з'яўляюцца мемарыяльнымі музеямі (Якуба Коласа, Янкі Купалы, Адама Міцкевіча і інш.) [3].

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

З 1980-х гг. падыход да музеефікацыі сядзібы стаў больш шматгранным. Музейныя супрацоўнікі і рэстаўратары імкнуліся зафіксаваць і адлюстраваць у экспазіцыі ўсе асноўныя этапы развіцця сядзібы, лёс і вобразы найбольш вядомых яе жыхароў (Здраўнёва, Мерачоўшчына і інш.) [6, с. 392].

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. у сувязі з рэабілітацыяй у вачах грамадства ролі і месца дваранскага саслоўя ў сацыякультурным развіцці асобных рэгіёнаў і краіны ў цэлым, адраджэннем цікавасці да дваранскага ладу жыцця праяўляецца тэндэнцыя да выкарыстання сядзібных комплексаў у якасці элітных дамоў адпачынку, творчасці, турыстычных цэнтраў з аднаўленнем асобных бакоў дваранскага побыту. Гэта захоўвае сядзібы ад разбурэння з-за безгаспадарчага стаўлення (напрыклад, палацава-паркавы ансамбль Валовічаў у Свяцку, сядзібны дом у Каранёўцы).

Складанасць і шматграннасць сядзібы як комплексу архітэктурных, ландшафтных, гаспадарчых аб'ектаў абумоўліваюць неабходнасць комплекснага характару яе музеефікацыі. У адносінах да кожнага складніка сядзібна-ландшафтнага комплексу выкарыстоўваюцца свае метады музеефікацыі. У сядзібным доме, як правіла, захоўваецца або ўзнаўляецца інтэр'ер жылога памяшкання і ствараюцца гісторыка-біяграфічныя экспазіцыі, прысвечаныя таму ці іншаму дзеячу гісторыі і культуры. Разам з тым імкненне падаць сядзібу ў яе цэласнасці прыводзіць да неабходнасці аднаўлення парку, надворных пабудоў, малых архітэктурных форм і інш. Тэрыторыя, ахопленая музеефікацыяй, мае тэндэнцыю да пашырэння. Тэарэтычна ў гэты працэс могуць быць уключаны найбліжэйшыя вёскі, навакольны ландшафт, якія непасрэдна звязаны з сядзібай [3].

Нельга пакінуць па-за ўвагай і прэзентацыю сядзібна-ландшафтных комплексаў праз турыстычную дзейнасць. Павелічэнне колькасці экскурсантаў на сучасным этапе існавання сядзібна-ландшафтных комплексаў з'яўляецца даволі важным. Пры сядзібах мэтазгодна ствараць традыцыйную вытворчасць на базе старых тэхналогій (традыцыйныя рамёствы, промыслы і інш.). Акрамя гэтага, магчыма арганізацыя мерапрыемстваў, прысвечаных гісторыі краю ці вядомым дзеячам, правядзенне фестываляў, тэатралізаваных відовішчаў і г. д. Прывабнасць аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны павялічвае турысцкі паток, а частка атрыманых ад гэтага віду дзейнасці сродкаў можа быць выкарыстана на яго ўтрыманне. Аднак нельга пакідаць па-за ўвагай і празмерную эксплуатацыю сядзібна-ландшафтных комплексаў у мэтах экскурсійнага паказу, што таксама можа нанесці шкоду.

Для прыстасаваных пад сучаснае выкарыстанне сядзібна-ландшафтных комплексаў бачыцца магчымым і больш эфектыўным прынцып іх развіцця як ахоўных гісторыка-культурных і прыродных плошчаў: арганізацыя тэрыторыі ў больш шырокіх, гістарычна абумоўленых гаспадарчых межах, чым ахоўная зона ці ландшафтны парк. Яна можа ўключаць не толькі архітэктурны комплекс, сядзібны парк і гаспадарчы двор, але і былыя сельскагаспадарчыя ўгоддзі, лясы, навакольныя вёскі. У гэтым выпадку гістарычная прастора адначасова напаўняецца эканамічнай базай адраджэння былой вытворчай спецыялізацыі.

Такім чынам, сядзібна-ландшафтны комплекс можна захоўваць і інтэрпрэтаваць з розных пунктаў гледжання, у залежнасці ад пастаўленых задач. Яго аднаўленне можа складацца з некалькіх узаемазвязаных этапаў:

– аднаўленне сядзібнага дома і гаспадарчых збудаванняў;

– узнаўленне помнікаў садова-паркавага мастацтва на тэрыторыі, дзе размяшчалася сядзіба;

– захаванне, рэстаўрацыя або рэканструкцыя сядзібнага культурнага ландшафту на пэўны момант часу ў мінулым;

– вызначэнне сувязі сядзібна-ландшафтных комплексаў з сучасным грамадствам, папулярызацыя і актуалізацыя ў інфармацыйнай прасторы, інтэрнэце, сродкамі музейнай і турыстычнай дзейнасці;

– стварэнне навукова-даследчага цэнтра па праблемах вывучэння сядзібнай культуры пэўнай мясцовасці.

**Спіс літаратуры**


1. **Кодекс Рэспублікі Беларусь аб культуры** : уступае ў сілу з 3 лютага 2017 г. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.
2. **Культурный ландшафт как объект наследия** / под. ред. Ю. А. Веденина, М. Е. Кулешовой. – М. : Институт Наследия; СПб. : Дмитрий Буланин, 2004. – 620 с.
3. **Музеи-усадьбы** [Электронный ресурс] // Российская музейная энциклопедия. – Режим доступа : http://www.museum.ru/rme/ sci_usad.asp. – Дата доступа : 13.01.2017.
4. **Руководство по выполнению Конвенции об охране всемирного наследия** [Электронный ресурс] // ООН по вопросам образования, науки и культуры ; Межправительственный комитет по охране всемирного культурного и природного наследия ; Центр всемирного наследия. – Режим доступа : http://whc.unesco.org/archive/opguide-rus.pdf. – Дата доступа : 11.01.2017.
5. **Федорук, А. Т.** Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2004. – 572 с.
6. **Шулепова, Э. А.** Музеефикация памятников / Э. А. Шулепова // Российская музейная энциклопедия : в 2 т. / Рос. ин-т культурологии МК РФ и РАН ; редкол. : В. Л. Янин (пред.) [и др.]. – М. : Прогресс : Рипол классик, 2001. – Т. 1. – С. 390 – 392.



**Дзмітрый ГЕРАСІМЁНАК,**
аспірант Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтваў.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 14 сакавіка 2017 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ